НЕЗАБЫЎНЫЯ ПАДЗЕІ, МУЖНЫЯ ЛЮДЗІ

# СЯМ'Я ПАРТЫЗАНСКАЯ





Вёска Саковічы. Вакол круглага люстранога возера раскінуліся светлыя дамы рабочых саўгаса «Зара».

— Да вайны тут быў калгас «Рассвет», — гаворыць Дзмітрый Міхайлавіч Сцешыц, — а я яго старшынёй. Гаспадарка не тое каб багатая, але людзі жылі дружна.

Першы фашысцкі самалёт з чорнымі крыжамі на крылах праляцеў над вёскай на шосты дзень вайны, перакрэсліўшы ўсе нашы мірныя радасці і клопаты. Людзі зразумелі, што настаў трывожны час і рыхтаваліся да яго.

І Дзмітрый Сцешыц узяўся за зброю. У невялікай вёсцы Крушнікі, акружанай з усіх бакоў лесам, партызанская група, у якой былі таварышы Хініч, Бародзіч, Меркуль, Лопан і іншыя, быў выпрацаван сумесны план дзеянняў па разгортванню барацьбы з акупантамі і іх прыхваснямі — паліцаямі.

Хутка гэтая і іншыя партызанскія групы выраслі ў атрады, а затым у брыгады і злучэнні. Былі разгромлены многія гарнізоны. Партызаны рабілі глыбокія рэйды, па шляху знішчаючы прыстанішчы акупантаў, праводзілі сярод насельніцтва вялікую растлумачальную работу: чыталі зводкі Інфармбюро, расказвалі аб становішчы на франтах, заклікалі на барацьбу з акупантамі.

У сакавіку 1942 года Дзмітрый Міхайлавіч Сцешыц разам з атрадамі Пінскага партызанскага злучэння, якім камандаваў В. З. Корж, удзельнічаў у баявых дзеяннях супраць ворага на тэрыторыі былога Старобінскага, Жыткавіцкага і Ганцэвіцкага раёнаў.

У першыя дні вайны актыўна дапамагала партызанам і жонка Дзмітрыя Міхайлавіча Федосія Фёдараўна. Спачатку яна была сувязной, а затым, калі далейшае прабыванне ў вёсцы стала небяспечным, пайшла ў 1942 годзе ў атрад да мужа.

Муж і жонка Сцешыцы знаходзіліся ў радах народных мсціўцаў да прыходу Чырвонай Арміі.

Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх акупантаў, Дзмітрый Міхайлавіч працаваў у Пінску.

Ішлі гады. Дзмітрый Міхайлавіч і Федосія Фёдараўна выйшлі на пенсію. Іх пацягнула ў родныя мясціны і яны пасяліліся ў вёсцы Крушнікі, там, адкуль пачыналі свой нялёгкі шлях барацьбы з лютым ворагам.

У Сцешыцаў сваіх дзяцей не было. Яны ўзялі двух сірат. Выгадавалі і выхавалі іх. Дачка стала ўрачом, а сын служыць у Савецкай Арміі.

Камуністы саўгаса «Зара» выбралі Дзмітрыя Міхайлавіча членам бюро партыйнай арганізацыі. Нягледзячы на ўзрост, ён у меру сваіх сіл прымае ўдзел у грамадскім жыцці гаспадаркі.

У. НОВІК.

На здымках: муж і жонка Сцешыцы.

Фота М. ТКАЧЭНІ.